EU4Energy

Пагадненне мэраў
па клімаце і энергіі
Усходняе партнёрства

# ПАГАДНЕННЕ МЭРАЎ ВА УСХОДНІМ ПАРТНЁРСТВЕ:

# 10 ГОД ДАСЯГНЕННЯЎ У СФЕРЫ КЛІМАТУ І ЭНЕРГІІ


БЕЛАРУСЬ
УКРАІНА
МАЛДОВА


ГРУЗІЯ
АЗЕРБАЙДЖАН
АРМЕНІЯ



ЕС падтрымлівае Пагадненне Мэраў – Усход з 2011. Пра паспяховасць ініцыятывы ў рэгіёне сведчыць тое, што да яе ўжо далучыліся амаль 500 гарадоў! Таму гэта адзін з самых актыўных рэгіёнаў Глабальнага Пагаднення Мэраў, што сведчыць пра прыхільнасць мясцовых, рэгіянальных і нацыянальных уладаў да барацьбы з кліматычным крызісам і за стварэнне больш прыдатных для жыцця гарадскіх тэрыторый. Гэта адзін з мноства крокаў, патрэбных, каб зрабіць рэальным Еўрапейскі зялёны курс (European Green Deal) і ягонае бачанне Еўропы, як першага ў свеце кліматычна-нейтральнага кантынента.

Каб дасягнуць у гэтым поспеху, мы мусім упэўніцца, што да справы далучыліся ўсе - ад урадаў да асобных грамадзян. Пагадненне Мэраў мае ўнікальную магчымасць аб’ядноўваць розныя ўзроўні кіравання дзеля дасягнення пераменаў і прапаноўваць канкрэтныя рашэнні. Гэта ёсць і будзе ключавым фактарам поспеху ініцыятывы.

Сёння мы святкуем дасягненні першых дзесяці год ініцыятывы. Гэта толькі пачатак нашага супрацоўніцтва, гарады яшчэ толькі ў пачатку свайго шляху да ўстойлівасці. ЕС будзе пашыраць сваю падтрымку Пагаднення Мэраў - Усход і больш шырокіх “зялёных” рэформаў праз фінансаванне і тэхнічную экспертызу. Мы з нецярпеннем чакаем працягу нашай супрацы з сённешнімі і будучымі падпісантамі дзеля паляпшэння кліматычнай трываласці краін Усходняга Партнёрства і забеспячэння ўстойлівай, кліматычна-нейтральнай будучыні для ўсіх.



**Лорэнс Мэрэдыт**
Дырэктар усходняга накірунка палітыкі добрасуседства Генеральнага дырэктарата Еўрапейскай Камісіі па пытаннях пашырэння і палітыкі добрасуседства (DG NEAR)

# 10 год Пагаднення Мэраў ва ўсходніх краінах-суседках: ад замыслу падтрымкі ЕС да гарадскіх рэформаў



Нізкавуглеродная эканоміка і паляпшэнне якасці жыцця людзей – адзін з самых галоўных выклікаў для муніцыпалітэтаў па ўсім свеце. Санітарны крызіс не змяніў прыярытэтаў, а наадварот, абвастрыў неадкладную патрэбу ў імклівых дзеяннях. Гарады гатовыя зрабіць свой унёсак і Пагадненне Мэраў, зарэкамендавала сябе, як належны інструмент падтрымкі рэалізацыі іхных дзеянняў.

На працягу дзесяці год дзейнасці Офіс Пагаднення Мэраў – Усход аб’ядноўваў прадстаўнікоў зацікаўленых бакоў нацыянальнага узроўню, рэгіянальныя і мясцовыя ўлады, грамадскую супольнасць і жыхароў амаль 500 муніцыпалітэтаў у краінах Усходняга Партнёрства – Арменіі, Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне. Усё больш і больш мясцовых уладаў рэгіёну далучаюцца да ініцыятывы, каб устаць на шлях энергетычных і кліматычных рэформаў, дзяліцца сваім досведам, вывучаць найлепшыя практыкі, карыстацца тэхнічнай экспертызай і магчымасцямі фінансавання, матываваць адзін аднаго і разам шукаць эфектыўныя вырашэнні агульных праблем.

Краіны Усходняга Партнёрства змаглі пабудаваць супольнасць Пагаднення - моцную і гатовую падтрымаць - у якой Нацыянальныя і Тэрытарыяльныя Каардынатары, а таксама Прыхільнікі Пагаднення граюць важную ролю ў тым, каб дапамагчы Падпісантам выканаць іхныя абавязацельствы па скарачэнні выкідаў $CO_2$ і рэалізаваць меры па адаптацыі да кліматычных зменаў. Для нас гэта значнае дасягненне, якое стала ўзорам для заснавання новых Рэгіянальных Супольнасцяў Пагаднення ў іншых частках свету. Гэтая праца ідзе сумесна з моцнай камандай Пагаднення Мэраў - Усход (CoM East), якая аказвае пастаянную падтрымку ў сферы ўзмацнення патэнцыялу, тэхнічных кансультацый, распрацоўкі Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце, дзейнасці па камунікацыі і папулярызацыі і г.д., што адкрывае новыя перспектывы для Падпісантаў Пагаднення ў рэгіёне.

Для Энергетычных Гарадоў і ўсіх партнёраў кансорцыюму было справай гонару суправаджаць і падтрымліваць сям’ю Пагаднення Мэраў у краінах Усходняга Партнёрства на працягу гэтых дзесяці год. Іхныя значныя вынікі і паспяховыя дасягненні маюць станоўчы ўплыў на мноства іншых муніцыпалітэтаў у рэгіёне. Яны рухаюцца наперад і актывізуюць свае высілкі на шляху да кліматычнай нейтральнасці і, тым самым, знаходзяцца на пярэднім краі Галабальнай Супольнасці Пагаднення.



**Клэр Румэ**
Дырэктарка асацыяцыі “Энергетычныя Гарады” (Energy Cities)

# Этапы Пагаднення Мэраў

**Пагадненне Мэраў па клімаце і энергіі** - гэта ініцыятыва Еўрапейскага Саюза, што аб'ядноўвае мясцовыя і рэгіянальныя ўлады, якія добраахвотна ўзялі на сябе абавязацельствы дасягнуць на сваёй тэрыторыі мэты ЕС па клімаце і энергіі. На сёння Пагадненне Мэраў стала самай амбіцыйнай сусветнай гарадской кліматычнай і энергетычнай ініцыятывай, аб'яднаўшы больш за **10 600 Падпісантаў з 61 краін**, якія прадстаўляюць **337 млн жыхароў.**

## Эвалюцыя ініцыятывы ЕС

**2006**
Прыярытэтная мера паводле Плану ЕС па энергаэфектыўнасці

**2008**
Старт Пагаднення Мэраў
-20% $CO_2$ да 2020

**2011**
**Старт I фазы CoM East**
Phase I
-20% $CO_2$ да 2020

**2014**
Старт ініцыятывы "Mayors Adapt"
(Пагадненне Мэраў па адаптацыі да зменаў клімату)

**2016**
**Старт II фазы CoM East**
Новыя мэтавыя паказчыкі Пагаднення Мэраў па энергіі і клімаце
-30% $CO_2$ да 2030

**2021**
Далейшае ўдасканаленне энергетычных і кліматычных мер

**Пагадненне Мэраў - Усход (CoM East)** – найбуйнейшая ініцыятыва Пагаднення Мэраў па-за межамі ЕС, накіраваная на аб'яднанне мясцовых і рэгіянальных уладаў краін Усходняга Партнёрства (Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны) дзеля рэалізацыі ўстойлівых энергетычных палітык, скарачэння залежнасці ад выкапневага паліва, павышэння бяспекі энергазабеспячэння і забеспячэння глабальнага руху да змякчэння наступстваў кліматычных зменаў.
Больш за 480 Падпісантаў, што прадстаўляюць амаль 30 млн жыхароў краін Усходняга Партнёрства, далучыліся да ініцыятывы, добраахвотна узяўшы абавязацельствы скараціць выкіды $CO_2$ больш чым на 27 млн т, а таксама рэалізаваць меры па адаптацыі да зменаў клімату і змякчэнні іхных наступстваў.

**Фазы Пагаднення Мэраў – Усход (CoM East)**

**Фаза I**
**2011 – 2015**

- Казахстан
- Кыргызстан
- Таджыкістан
- Туркменістан
- Узбекістан
- Арменія
- Азербайджан
- Беларусь
- Грузія
- Малдова
- Украіна

**Фаза II**
**2016 – 2021**

- Арменія
- Азербайджан
- Беларусь
- Грузія
- Малдова
- Украіна

# Факты і лічбы супольнасці CoM East *

## ПАДПІСАНТЫ




- Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 20% да 2020**
- Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 30%** і рэалізаваць **меры па адаптацыі да зменаў клімату да 2030**
- **Падпісанты,** чый удзел прыпынены

Удзел Падпісантаў у ініцыятыве прыпыняецца, калі яны ў належны тэрмін не падаюць свае Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце (SE(C)AP) і маніторынгавыя справаздачы. Як толькі Падпісанты пададуць неабходныя дакументы, іхны ўдзел у Пагадненні Мэраў узнаўляецца.

## НАСЕЛЬНІЦТВА






* Тут і далей прыведзеныя звесткі на 1 мая 2021

** ад усяго насельніцтва краіны

## Дынаміка росту




## Абавязацельствы па скарачэнні выкідаў $CO_2$ *

| 2020 (20%) і 2030 (30%) $CO_2$ т $CO_2$/год | АРМЕНІЯ | АЗЕРБАЙДЖАН | БЕЛАРУСЬ | ГРУЗІЯ | МАЛДОВА | УКРАІНА | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 292,5 К | 65 тыс | 1,3 млн | 903 тыс | 167,2 тыс | 24,7 млн | 27,4 млн |
| ШТО ЭКВІВАЛЕНТНА: ① Колькасці высаджаных дрэваў | 13,3 млн | 3 млн | 61 млн | 41 млн | 7,6 млн | 1,1 млрд | 1,2 млрд |
| ② Колькасці людзей, што спынілі карыстацца новымі аўтамабілямі | 187 тыс | 42 тыс | 857 тыс | 579 тыс | 108,6 тыс | 15 млн | 17,6 млн |
| ③ Колькасці старых лямп накальвання, замененых на LED | 9,8 млн | 2,2 млн | 45 млн | 30,2 млн | 5,6 млн | 826 млн | 917 млн |

**1.** Паглынанне $CO_2$ адным дрэвам – 22 кг $CO_2$ у год
**2.** Выкіды $CO_2$ ад новага аўтамабіля – 1,56 т $CO_2$ у год
**3.** Замена адной лямпы накальвання на LED-лямпу скарачае выкіды $CO_2$ на 0,029 т у год

* Як адзначана ў прынятым Плане дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце

## Супольнасць Пагаднення

### Каардынатары Пагаднення

Нацыянальныя і суб-нацыяльныя ўлады, якія аказваюць стратэгічнае кіраванне, тэхнічную і фінансавую падтрымку Падпісантам Пагаднення і муніцыпалітэтам, жадаючым далучыцца да ініцыятывы. Каардынатары Пагаднення падтрымліваюць іх ў дасягненні смелых мэтаў і папулярызуюць Пагадненне Мэраў у межах сваёй кампетэнцыі. У прыватнасці, Каардынатары Пагаднення дапамагаюць Падпісантам распрацоўваць і рэалізоўваць іхныя Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце.

### Прыхільнікі Пагаднення

Нацыянальныя ці рэгіянальныя сеткі і асацыяцыі мясцовых ці рэгіянальных уладаў, агенцый і арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія аказваюць падтрымку Падпісантам Пагаднення Мэраў у межах сваёй кампетэнцыі і на розных узроўнях кіравання. Яны выкарыстоўваюць свой патэнцыял у сферах адвакацыі, камунікацыі і наладжвання кантактаў, каб папулярызаваць ініцыятыву і падтрымліваць выкананне абавязацельстваў Падпісантаў Пагаднення.

| | Нацыянальныя 10 | Тэрытарыяльныя 15 | Прыхільнікі Пагаднення 14 |
|---|---|---|---|
| AM | • Міністэрства тэрытарыяльнага адміністравання і інфраструктуры Рэспублікі Армения | | • Саюз супольнасцяў Арменіі<br>• Фонд энергазберажэння<br>• Армянскі фонд узнаўляльных крыніц энергіі і энергаэфектыўнасці |
| AZ | • Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Азербайджан | | |
| BY | • Дэпартамент энергаэфектыўнасці дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь<br>• Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь | | • Фонд “Інтэракцыя”<br>• Міжнароднае грамадскае аб’яднанне "Экапартнёрства" |
| GE | • Міністэрства эканомікі і ўстойлівага развіцця Грузіі<br>• Міністэрства аховы навакольнага асяроддзя і сельскай гаспадаркі Грузіі | • Дзяржаўны прадстаўнік у рэгіёне Гурыя<br>• Дзяржаўны прадстаўнік у рэгіёне Мцхета-Мтыянеці<br>• Дзяржаўны прадстаўнік у рэгіёне Кахеты | • Нацыянальная асацыяцыя мясцовых уладаў Грузіі (NALAG)<br>• Цэнтр энергаэфектыўнасці Грузіі<br>• Каўказская сетка за ўстойлівае развіццё горных рэгіёнаў |
| MD | • Міністэрства эканомікі і інфраструктуры<br>• Міністэрства сельскай гаспадаркі, рэгіянальнага развіцця і навакольнага асяроддзя | | • Альянс за энергаэфектыўнасць і ўзнаўляльныя крыніцы (AEER)<br>• Кангрэс мясцовых уладаў (CALM)<br>• Саюз раённых саветаў Рэспублікі Малдова |
| UA | • Міністэрства развіцця супольнасцяў і тэрыторый Украіны<br>• Міністэрства аховы навакольнага асяроддзя і прыродных рэсурсаў Украіны | • Абласныя дзяржаўныя адміністрацыі: Чарнігаўская, Данецкая, Херсонская, Кіравоградская, Кіеўская, Львоўская, Вінніцкая, Валынская Палтаўская<br>• Рэгіянальныя рады: Днепр, Харкаў<br>• Раённая рада Міжгір’я (у працэсе рэфармавання) | • Добраахвотная асацыяцыя мясцовага самакіравання “Асацыяцыя “Энергаэфектыўныя гарады Украіны”<br>• Асацыяцыя аб’яднаных тэрытарыяльных супольнасцяў<br>• Усеўкраінская асацыяцыя мясцовых уладаў “Асацыяцыя гарадоў Украіны” |

# 28 ПАДПІСАНТАЎ

# ПАГАДНЕННЕ МЭРАЎ У АРМЕНІІ



- **7** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 20% да 2020**
- **20** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 30%** і рэалізаваць меры **па адаптацыі да зменаў клімату да 2030**
- **1** Падпісанты, чый удзел **прыпынены**
- **5** Падпісанты, якія рэалізавалі ці рэалізуюць **дэманстрацыйныя праекты CoM-DeP**






**1,78** млн

кожны **2** жыхар Арменіі жыве на тэрыторыі Падпісантаў Пагаднення

**59,9%** насельніцтва краіны

*Пагадненне Мэраў – гэта ўнікальная ініцыятыва, якая ўжо аб'яднала ўлады 27 мясцовасцяў Арменіі, адданых устойліваму, зялёнаму і кліматычна-трываламу развіццю, якое б адпавядала нацыянальнай стратэгіі ў галіне энергіі і клімату. Я ўпэўнены, што надзейная дапамога мясцовых уладаў, якія прадэманстравалі палітычную волю, далучыўшыся да гэтага ўплывовага еўрапейскага добраахвотнага руху, у рэшце рэшт адыграе істотную ролю ў дэманстрацыі несумненных пераваг шляха кліматычна-нейтральнага развіцця і ў дасягненні поспехаў у барацьбе з глабальнымі зменамі клімату.*

***Ашот Гілаян***
*Глава Дэпартамента палітыкі мясцовага самакіравання Міністэрства тэрытарыяльнай адміністрацыі і інфраструктуры Рэспублікі Арменія, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*



## Рост колькасці падпісантаў




| | |
|---|---|
| **Падалі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 11 |
| **Прынялі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 11 |

## Найлепшыя практыкі

**• Спітак: Поўная тэрмаізаляцыя шматкватэрных будынкаў**
Пяць шматкватэрных будынкаў прайшлі поўную тэрмарэнавацыю, што прывяло да 65% эканоміі энергіі, большага цеплавога камфорту ў кватэрах, павысіла іхную рынкавую вартасць і прывяло да штогадовай грашовай эканоміі прыкладна ў 25 000 еўра.

**• Ерэван: Энергаэфектыўная мадэрнізацыя сістэм вулічнага асвятлення**
Рэалізацыя новай сістэмы асвятлення, заснаванай на светладыёдных (LED) тэхналогіях, прывяла да эканоміі 618 МВт·г у год, скарачэння выкідаў парніковых газаў на 274 т $CO_2$ у год і штогадовай эканоміі выдаткаў на эксплуатацыю і абслугоўванне ў 65 470 еўра.

www.com-east.eu/en/case-studies/

*Дзякуючы далучэнню да ініцыятывы Пагадненне Мэраў у 2014, псіхалогія і ідэалогія жыхароў Спітака змянілася. Мы ўсе сталі больш энергаэфектыўнымі. Заўважаючы карысць ад далучэння да Пагаднення для жыхароў Спітака, Савет Старэйшын Спітака вырашыў далучыцца да новай, больш амбіцыйнай фазы Пагаднення – ініцыятывы Пагадненне Мэраў па клімаце і энергіі. Мы спадзяемся, што ў бліжэйшай будучыні поспех нашай супольнасці будзе яшчэ большым, што найперш і перадусім паспрыяе самой супольнасці і яе жыхарам.*

***Гагік Саакян***
*Мэр Спітака, Прэзідэнт Клуба Пагаднення Мэраў у Арменіі*



# ПАГАДНЕННЕ МЭРАЎ У АЗЕРБАЙДЖАНЕ

**8 ПАДПІСАНТАЎ**

- **1** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 20% да 2020**
- **7** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 30%** і рэалізаваць меры **па адаптацыі да зменаў клімату да 2030**




**0,8 млн** — кожны **13** жыхар Азербайджана жыве на тэрыторыі Падпісантаў Пагаднення

**8%** насельніцтва краіны

## Рост колькасці падпісантаў




| | |
|---|---|
| **Падалі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 2 |
| **Прынялі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 1 |
| **Падалі** маніторынгавыя справаздачы | 1 |



*Пагадненне Мэраў – Усход – гэта карысная платформа для сустрэч, дыскусій і абмену досведам для нашых спецыялістаў у галіне ўстойлівай энергіі і клімату, а таксама для прадстаўнікоў муніцыпалітэтаў са сваімі калегамі з краін Усходняга Партнёрства і Еўрапейскага Саюза. У бліжэйшае дзесяцігоддзе да 2030 наша краіна, у адпаведнасці з канцэпцыяй "Азербайджан 2030 – Нацыянальныя прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця", ухваленай Прэзідэнтам Рэспублікі Азербайджан Ільхамам Аліевым у лютым гэтага года, імкнецца стаць краінай "зялёнага росту" і распрацаваць зоны "зялёнай энергіі". У гэтым кантэксце ўжо пачалася праца па паляпшэнні заканадаўчай базы, рэалізацыя пры дапамозе замежных інвестыцый камунальных праектаў на ветравых і сонечных электрастанцыях, распрацоўка канцэпцый "Разумны горад" і "Разумная вёска" і іншыя энергаэфектыўныя меры. Мы спадзяемся, што наш пастаянны актыўны ўдзел ў Пагадненні Мэраў – Усход паспрыяе паспяховай рэалізацыі Нацыянальных прыярытэтаў па ўстойлівай энергіі і клімаце*

***Самір Веліеў***
*Намеснік Міністра энергетыкі Азербайджана, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*



# 58 ПАДПІСАНТАЎ

# ПАГАДНЕННЕ МЭРАЎ У БЕЛАРУСІ




- **3** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 20% да 2020**
- **52** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 30%** і рэалізаваць меры па **адаптацыі да зменаў клімату да 2030**
- **3** Падпісанты, чый удзел **прыпынены**
- **4** Падпісанты, якія рэалізавалі ці рэалізуюць **дэманстрацыйныя праекты CoM-DeP**




амаль кожны **2** жыхар краіны жыве на тэрыторыі Падпісантаў Пагаднення

**45%** насельніцтва краіны

*Выконваючы ў межах ініцыятывы Пагаднення Мэраў абавязацельствы па скарачэнні выкідаў парніковых газаў як мінімум на 30% да 2030, мясцовыя ўлады падтрымліваюць рэалізацыю Беларуссю нашых нацыянальных абавязацельстваў у межах Парыжскага Пагаднення. Важнай часткай іхнай працы таксама з'яўляюцца меры па адаптацыі да зменаў клімату, заснаваныя на прыродных рашэннях.*

***Баляслаў Пірштук***
*Першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і ахловы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*



| | |
|---|---|
| **Падалі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 21 |
| **Прынялі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 13 |
| **Падалі** маніторынгавыя справаздачы | 8 |



*Мы разглядаем Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце, распрацаваныя падпісантамі Пагаднення Мэраў, як эфектыўныя інструменты доўгатэрміновага планавання, накіраваныя на павышэнне энергаэфектыўнасці і пашырэнне выкарыстання ўзнаўляльных рэсурсаў, а таксама прыцягнення фінансавання для рэалізацыі запланаваных мер. Такая дзейнасць гарадскіх і раённых адміністрацый поўнасцю адпавядае Дзяржаўнай Праграме "Энергазберажэнне" на 2021-2025 і спрыяе дасягненню яе мэтаў і паказчыкаў*

***Андрэй Мінянкоў***
*Глава аддзела навукова-тэхнічнай палітыкі і знешніх эканамічных сувязяў Дэпартамента энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*

## Рост колькасці падпісантаў




## Найлепшыя практыкі

**• Баранавічы: Біягазавая ўстаноўка на гарадскіх водаачысных збудаваннях**
Горад Баранавічы – першы ў Беларусі, дзе пабудавалі біягазавую ўстаноўку, што ператварае каналізацыйны іл ва ўзнаўляльную энергію

**• Полацк: PubLiCity – мадэрнізацыя вулічнага асвятлення**
У межах гэтага найбуйнейшага ў Беларусі праекта мадэрнізацыі вулічнага асвятлення, у Полацку былі ўсталяваныя амаль 2000 LED-ліхтароў з "разумнай" сістэмай кіравання, а 26 гарадскіх будынкаў, помнікаў і іншых аб'ектаў былі абсталяваныя эфектыўнай архітэктурнай падсветкай.

www.com-east.eu/en/case-studies/

*Навагрудскі раён адным з першых у Беларусі далучыўся да ініцыятывы Пагаднення Мэраў па клімаце і энергіі, і з'яўляецца лідарам у краіне па выкарыстанні энергіі ветру і сонца. У 2020 годзе ўзнаўляльныя крыніцы энергіі пакрывалі 55% усіх патрэб раёна ў электраэнергіі. Мы маем каштоўны досвед рэалізацыі некалькіх праектаў у гэтым сектары коштам больш чым 6 млн еўра. Прыцягнутыя інвестыцый дапамагаюць скарачаць выкіды парніковых газаў, што з'яўляецца значным унёскам у захаванне планеты для будучых пакаленняў*

***Алена Сялевіч***
*Першая намесніца старшыні Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта*



# ПАГАДНЕННЕ МЭРАЎ У ГРУЗІІ

**24 ПАДПІСАНТАЎ**

- **3** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 20% да 2020**
- **21** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 30%** і рэалізаваць меры па **адаптацыі да зменаў клімату да 2030**
- **2** Падпісанты, якія рэалізавалі ці рэалізуюць **дэманстрацыйныя праекты CoM-DeP**




**2,34 млн**

кожны **2** жыхар краіны жыве на тэрыторыі Падпісантаў Пагаднення

**63%** насельніцтва краіны



*Уключаючы энергаэфектыўнасць і ўзнаўляльную энергію ў рэчышча стратэгічных накірункаў энергетычнай палітыкі краіны, урад дапамагае грузінскім Падпісантам выканаць абавязацельствы ў межах Пагаднення, умацоўваць трываласць да зменаў клімату і спрыяць устойліваму развіццю краіны.*

***Натэла Турнава***
*Міністарка эканомікі і ўстойлівага развіцця Грузіі*

| | |
|---|---|
| **Падалі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 10 |
| **Прынялі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 10 |
| **Падалі** маніторынгавыя справаздачы | 1 |

## Рост колькасці падпісантаў




*Грузія прызнае істотную ролю муніцыпалітэтаў у дасягненні мэтавых паказчыкаў нацыянальна-вызначаемага ўнёску, асабліва тых муніцыпалітэтаў, якія з'яўляюцца Падпісантамі Пагаднення Мэраў. Дзеля ўмацавання вертыкальнай каардынацыі, Савет высокага ўзроўня па зменах клімату, заснаваны ў 2020, прадугледжвае спецыяльную пазіцыю для старшыні працоўнай групы Пагаднення Мэраў.*

***Леван Давіташвілі***
*Міністр аховы навакольнага асяроддзя і сельскай гаспадаркі Грузіі*





*Руставі – адзін з найважнейшых прамысловых цэнтраў у краіне і экалагічная сітуацыя з'яўляецца прыярытэтам для кожнага жыхара нашага горада. Будучы Падпісантам Пагаднення Мэраў вось ужо 10 год, Руставі мае дастаткова прычын заявіць, што мы паспяхова выконваем абавязацельствы ў межах Пагаднення, каб змяніць экасістэму горада да лепшага.*

***Іраклі Табагуа***
*Мэр Руставі*

## Найлепшыя практыкі

- **Сігнахі: Зялёная энергія для дзяцей з Эрысымедзі**
  Укараненне энергаэфектыўных тэхналогій прывяло да гадавой вытворчасці 5 МВт·г чыстай энергі, што, у сваю чаргу, прывяло да зніжэння энергетычнай залежнасці дзіцячага садка на 15% і гадавога скарачэння выкідаў $CO_2$ на 11 тон.
- **Ахмета, Казбегі, Горы, Мцхета: Электрычнасць для вёсак, не падлучаных да энергасеткі**
  Праект усталяваў сонечныя фотаэлектрычныя мікра-электрастанцыі для электрыфікацыі 87 горных вёсак. У выніку было выпрадукавана 156 МВт·г чыстай узнаўляльнай энергіі, выкіды $CO_2$ скараціліся на 15,6 тон у год, а сярэдняя грашовая эканомія складае 7 200 еўра.

www.com-east.eu/en/case-studies/

# 68 ПАДПІСАНТАЎ

# ПАГАДНЕННЕ МЭРАЎ У МАЛДОВЕ






- 12 Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 20% да 2020**
- 42 Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 30%** і рэалізаваць меры па адаптацыі да зменаў клімату да 2030
- 14 Падпісанты, чый удзел **прыпынены**
- 4 Падпісанты, якія рэалізавалі ці рэалізуюць дэманстрацыйныя **праекты Comdex**

**1,02 млн**

кожны **3** жыхар краіны жыве на тэрыторыі Падпісантаў Пагаднення

**36,4 %** насельніцтва краіны

| | |
|---|---|
| **Падалі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 23 |
| **Прынялі** Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 11 |
| **Падалі** маніторынгавыя справаздачы | 6 |

*У адпаведнасці са сваёй Энергетычнай Стратэгіяй да 2030, Рэспубліка Малдова прыярытэзуе энергаэфектыўнасць і ўзнаўляльную энергію як два скрайне важных элементы стратэгічнага накірунку ўстойлівага развіцця, стаўшы адной з першых краін Энергетычнай Супольнасці , якая пераняла і выкарыстала адпаведны досвед ЕС у гэтай сферы. Пагадненне Мэраў, будучы "нізавой" ініцыятывай, робіць моцны ўнёсак у выкананне нацыянальных абавязацельстваў і дэманструе, як еўрапейская палітыка ўстойлівай энергіі ўцелаўляецца ў адчувальныя вынікі і ўплывае на грамадзян Малдовы.*

***Міхаіл Лупашку***
*Генеральны сакратар міністэрства эканомікі і інфраструктуры, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*



## Рост колькасці падпісантаў






*Рэспубліка Малдова ратыфікавала Парыжскае Пагадненне і стала чацвёртай краінай, якая падала свой другі нацыянальна-вызначаемы ўнёсак у Рамачную канвенцыю ААН па зменах клімату, тым самым абавязаўшыся скараціць свае выкіды парніковых газаў як мінімум на 70% да 2030. Пагадненне Мэраў мабілізуе супольнасці на тое, каб дасягнуць нацыянальных мэтавых паказчыкаў праз практычныя крокі на мясцовым узроўні і, такім чынам, зрабіць свой маленькі ўнёсак у кліматычную павестку на еўрапейскім і глабальным узроўні*

***Іон Пержу***
*Міністр сельскай гаспадаркі, сельскага развіцця і навакольнага асяроддзя, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*

## Найлепшыя практыкі

- **Кэлэраш: Самы энергаэфектыўны грамадскі будынак у Малдове**
Дзіцячы садок DoReMiCi быў пабудаваны паводле нямецкіх стандартаў пасіўных дамоў і ў адпаведнасці з еўрапейскімі нормамі энергаэфектыўнасці. Гадавыя выдаткі на ягонае абслугоўванне на 90% ніжэйшыя, чым у "класічных" будынкаў дзіцячых садкоў.
- **Кантэмір і Окніца: Мадэрнізацыя вулічнага асвятлення**
Выкарыстоўваючы інавацыйныя тэхналогіі, два невялікіх муніцыпалітэты з агульным насельніцтвам 15 000 жыхароў дасягнулі скарачэння выкідаў $CO_2$ на 268 тон у год і грашовай эканоміі больш чым у 68 000 еўра. Гэты праект стаў пераможцам Прэміі ЕС у галіне ўстойлівай энергіі для краін Усходняга Партнёрства.

www.com-east.eu/en/case-studies/

*Для Кантэміра ўступленне ў сям'ю еўрапейскага Пагаднення Мэраў азначала пачатак непарыўнага працэсу зменаў у горадзе. З 2013 мы змаглі рэалізаваць дэманстрацыйныя праекты і палепшыць сітуацыю з энергаэфектыўнасцю на мясцовым узроўні. Для нас Пагадненне Мэраў – гэта стымул трансфармаваць Кантэмір у еўрапейскі зялёны горад*

***Раман Чубачук***
*Мэр Кантэміра*



# ПАГАДНЕННЕ МЭРАЎ ВА УКРАІНЕ

**295** ПАДПІСАНТАЎ

- **64** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 20% да 2020**
- **195** Абавязаліся скараціць выкіды $CO_2$ **як мінімум на 30%** і рэалізаваць **меры па адаптацыі да зменаў клімату** да 2030
- **36** Падпісанты, чый удзел **прыпынены**
- **17** Падпісанты, якія рэалізавалі ці рэалізуюць **дэманстрацыйныя праекты CoM-DeP**




**20,2 млн**

кожны **2** жыхар краіны жыве на тэрыторыі Падпісантаў Пагаднення

**51,2%** насельніцтва краіны



*Нядаўняя рэформа мясцовага самакіравання адкрыла вялікія магчымасці для ўкраінскіх Падпісантаў Пагаднення Мэраў у галіне паляпшэння энергаменеджменту і адаптацыі да зменаў клімату, у асаблівасці для прыцягнення знешніх крыніц фінансавання і інвестыцый. У гэтым кантэксце, наша місія – спрыяць рэалізацыі палітыкі развіцця мясцовай устойлівай энергіі, якая, у рэшце рэшт, дапаможа дасягнуць нацыянальных мэтаў па энергаэфектыўнасці.*

***Васіль Лазінскі***
*Першы намеснік міністра супольнасцяў і тэрытарыяльнага развіцця Украіны, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*

| | |
|---|---|
| **Падалі** Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 163 |
| **Прынялі** Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) | 78 |
| **Падалі** маніторынгавых справаздач | 59 |

## Рост колькасці падпісантаў




*Важная задача ў нашай павестцы – гэта адаптацыя нашых супольнасцяў да зменаў клімату і іхняга негатыўнага ўплыву. Пагадненне Мэраў па клімаце і энергіі дазваляе сваім Падпісантам распрацоўваць і рэалізоўваць уласныя стратэгіі кліматычнай адаптацыі. Як Нацыянальны Каардынатар Пагаднення Мэраў, Міністэрства спрычыняецца да рэалізацыі і забеспячэння ўстойлівасці гэтага працэсу.*

***Ірына Стаўчук***
*Намесніца міністра аховы навакольнага асяроддзя і прыродных рэсурсаў Украіны па пытаннях еўрапейскай інтэграцыі, Нацыянальны Каардынатар Пагаднення*





*У Пагадненні Мэраў мы знайшлі новыя перспектывы для паляпшэння эфектыўнасці і дасягнення энергетычнай незалежнасці грамадскага, жылога і прыватнага сектараў, каб забяспечыць устойлівае развіццё нашага горада і значна павысіць стандарты жыцця нашых жыхароў.*

***Аляксандр Сымчышын***
*Мэр Хмяльніцкага*

## Найлепшыя практыкі

- **Марыуполь: Сістэма энергаменеджменту ISO 50001**
Укараненне энергаэфектыўнай сістэмы энергаменеджменту дазволіла гораду рэалізаваць дзясяткі энергаэфектыўных праектаў і дасягнуць уражвальных вынікаў у справе скарачэння выкідаў $CO_2$ і энергаспажывання.
- **Міргарад: Мадэрнізацыя сістэмы цэнтральнага ацяплення**
Праект дазволіў муніцыпалітэту павялічыць долю ўзнаўляльнай энергіі (біямасы) у мясцовым энергабалансе, скараціць выкіды парніковых газаў і дасягнуць значнай грашовай эканоміі.

www.com-east.eu/en/case-studies/

# Падтрымка ЕС у справе пашырэння Пагаднення Мэраў у рэгіёне Усходняга Партнёрства

## УМАЦАВАННЕ ПАТЭНЦЫЯЛУ

**Умацаванне патэнцыялу** – гэта шэраг мер, накіраваных на ўзмацненне экспертызы Падпісантаў, Прыхільнікаў, Нацыянальных і Тэрытарыяльных Каардынатараў Пагаднення у сферы энергіі і кліматычнай палітыкі праз правядзенне разнастайных тэматычных семінараў, вэбінараў, варштатаў, адукацыйных паездак, абменаў спецыялістамі, асабістых кансультацый і г.д.

Падчас **Фазы I (2011-2016)** мерапрыемствы па ўмацаванні патэнцыялу ў межах Пагаднення Мэраў – Усход факусаваліся на падвышэнні інфармаванасці пра ініцыятыву Пагаднення Мэраў, а таксама на заахвочванні муніцыпалітэтаў далучацца да Пагаднення. Падчас першага этапу праекта, Офіс Пагаднення Мэраў – Усход арганізаваў серыю трэнінгаў, накіраваных на ўзмацненне патэнцыялу супрацоўнікаў муніцыпалітэтаў у галіне распрацоўкі Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце, і дапамог Падпісантам Пагаднення падрыхтаваць свае першыя стратэгіі ў рэгіёне Усходняга Партнёрства.

Падчас **Фазы II (2016-2021)** фокус актыўнасцяў па ўмацаванні патэнцыялу быў перанесены на аспекты рэалізацыі. Каманда Пагаднення Мэраў – Усход дапамагла муніцыпалітэтам сваімі ведамі па тэхнічных і фінансавых пытаннях, дапамагла Падпісантам Пагаднення распрацоўваць Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) і рыхтаваць маніторынгавыя справаздачы.

*Трэнінг па фінансавых аспектах Плана дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце быў сапраўды добра падрыхтаваны і ўсе сэсіі патрабавалі нашага актыўнага ўключэння ў дыскусію і практычныя практыкаванні. Гэта было сапраўды карысна і ясна для нас. Мы даведаліся пра галоўныя фінансавыя індыкатары, якія выкарыстоўваюцца для ацэнкі энергаэфектыўных мер, пра тое, як падрыхтаваць праект, які можа быць прафінансаваны і чаго ад нас чакаюць донары*

***Алена Расанцава***
*СеверадANEцк (Украіна)*




За 10 год дзейнасці Пагаднення Мэраў у рэгіёне Усходняга Партнёрства былі арганізаваныя 103 трэнінгі, у якіх прынялі ўдзел больш за 3 300 навучэнцаў. У выніку Падпісанты Пагаднення Мэраў – Усход распрацавалі і падалі 240 Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце) і 75 маніторынгавых справаздач.

*У Рэспубліцы Беларусь існуе праблема павышэння інтэнсіўнасці ападкаў; аднак, сістэмы ліўневых сцёкаў не адаптаваныя для новых кліматычных выклікаў. У выніку трэнінга па адаптацыі да кліматычных зменаў, які правяла каманда Пагаднення Мэраў – Усход, горад Баранавічы палепшыў меры ў водным сектары, рэалізаваныя ў межах Плану дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце. Яны былі паспяхова выкананыя, дзякуючы рашэнням, прапанаваным на трэнінгу, што прадугледжвалі комплекснае выкарыстанне зялёнай, шэрай і блакітнай інфраструктуры.*

***Уладзімір Зуеў***
*Гарадскі савет Баранавічаў (Беларусь)*

# СЛУЖБА ПАДТРЫМКІ

У 2011 – 2021 цэнтральная і нацыянальныя службы падтрымкі Пагаднення Мэраў – Усход прапаноўвалі рэлевантную экспертызу і падтрымку Падпісантам Пагаднення і іншым зацікаўленым бакам у краінах Усходняга Партнёрства, апрацаваўшы больш за 5 000 заявак на кансультацыі.




**Заяўкі на кансультацыйную падтрымку датычыліся:**

- Працэдуры далучэння да Пагаднення Мэраў
- Працэсу падпісання новых абавязацельстваў
- Распрацоўкі і рэалізацыі Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце
- Распрацоўкі базавага кадастру выкідаў і мер па змякчэнні наступстваў кліматычных зменаў
- Ацэнкі кліматычных рызык і ўразлівасцяў
- Магчымасцяў фінансавання муніцыпальных праектаў
- Падрыхтоўкі маніторынгавых справаздач і інтэрпрэтацыі зваротнай сувязі ад Аб'яднанага даследчага цэнтра
- Удасканалення апісанняў уразлівасцяў для розных сектараў і магчымых меры па адаптацыі

# ПРАГРАМА АБМЕНАЎ CITY2CITY

У 2018 праектная каманда Пагаднення Мэраў – Усход запусціла новую праграму абменаў **City2City**, каб заснаваць платформу для абмену ідэямі, досведам і найлепшымі практыкамі Падпісантаў Пагаднення ў сферах энергаэфектыўнасці, развіцця ўстойлівай энергетыкі і палітыкі адаптацыі да кліматычных зменаў праз серыю адукацыйных візітаў на **двух розных узроўнях – палітычным** (мэры/віцэ-мэры) і **тэхнічным** (энергаменеджэры). Праграма дапамагла ўдзельнікам палепшыць свае веды, атрымаць практычныя навыкі і знайсці эфектыўныя рашэнні ў тэматычных кластэрах, якія ахоплівалі ключавыя сектары муніцыпальных Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце.

**1 адукацыйны візіт на ўзроўні мэраў** — у Рыгу і Елгаву (Латвія) **– 9 аб'ектаў для наведвання ў абодвух гарадах – 18 удзельнікаў** з **6 краін Усходняга Партнёрства**




*Пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза і офіса Пагаднення Мэраў – Усход у 2019 мы з калегамі з 6 краін атрымалі цудоўную магчымасць наведаць Рыгу і Елгаву (Латвія). Варта адзначыць, што досвед былых савецкіх краін вельмі рэлевантны і цікавы для краін Усходняга Партнёрства, паколькі, у прынцыпе, мы мелі падобныя выклікі і праблемы ў 1991. Усе візіты на аб'екты былі дэталёва спланаваныя і я ўдзячны камандзе Пагаднення Мэраў – Усход за такую насычаную адукацыйную паездку. Мы атрымалі падказкі, у якім накірунку рухацца і як рэалізоўваць энергаэфектыўныя праекты ў нашым муніцыпалітэце. Як мэр горада, я планую прымяніць веды, атрыманыя ад маіх калег з Рыгі і Елгавы. У прыватнасці, я збіраюся распрацаваць мясцовую праграму рэнавацыі жылых будынкаў, каб сумесна фінансаваць тэрмарэнавацыю шматкватэрных будынкаў*

**Юрый Фамічоў**
*мэр Славуціча (Украіна)*

*Праграма была насычанай і карыснай. У нас была магчымасць пазнаёміцца з тэхнічнымі звесткамі і рашэннямі прасунутых энергаэфектыўных праектаў і палепшыць нашыя веды працэса распрацоўкі Плана дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце. Хачу падзякаваць праекту Пагадненне Мэраў – Усход за такую дзейнасць, якая матывуе і натхняе на яшчэ больш прадуктыўную працу ў нашых муніцыпалітэтах.*

**Тамар Пурцеладзэ**
*Гурджаані (Грузія)*

**13 адукацыйных візітаў тэхнічнага ўзроўню** да актыўных Падпісантаў Пагаднення Мэраў **– 8 гарадоў-гаспадароў – 84 удзельнікі з Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны –**

**25 Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце** распрацавана і адпраўлена.

## ІНВЕСТЫЦЫІ, НЕАБХОДНЫЯ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПЛАНАЎ ДЗЕЯННЯЎ ПА ЎСТОЙЛІВАЙ ЭНЕРГІІ І КЛІМАЦЕ*




* Паводле звестак з ухваленых Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце

# Наладжванне сувязяў і супрацоўніцтва з ключавымі зацікаўленымі бакамі

## Пагадненне Мэраў укараняецца ў нацыянальныя палітыкі і стратэгіі

Інтэграцыя энергетычных і кліматычных мэтаў у нацыянальныя палітыкі і стратэгіі, забеспячэнне ўстойлівасці развіцця Пагаднення Мэраў у краінах Усходняга Партнёрства і адаптацыя энергетычных і кліматычных мэтаў Пагаднення Мэраў да рэгіянальнага кантэксту – адны са стратэгічных мэтаў Пагаднення Мэраў - Усход. Планаванне ўстойлівай энергіі і клімату на базе метадалогій і інструментаў Пагаднення Мэраў з'яўляецца эфектыўным інструментам, адаптаваным да спецыфічных патрэб Падпісантаў з рэгіёну Усходняга Партнёрства і ўжо інтэграваным ў шэраг важных стратэгічных дакументаў на нацыянальным узроўні ў кожнай з краін Усходняга Партнёрства.

## Каардынацыйная платформа муніцыпальнага развіцця

У снежні 2018 праект Пагадненне Мэраў – Усход ініцыяваў новы фармат супрацоўніцтва і наладжвання сувязяў для Падпісантаў Пагаднення з краін Усходняга Партнёрства – Каардынацыйную платформу муніцыпальнага развіцця (MDCP). Яна накіраваная на ўзмацненне і пашырэнне дыялогу паміж мясцовымі і рэгіянальнымі ўладамі, нацыянальнымі і замежнымі бенефіцыярамі, дзеля стварэння спрыяльнага асяроддзя ў супольнасцях для ўстойлівага энергетычнага развіцця і паспяховай рэалізацыі мер па змякчэнні наступстваў кліматычных зменаў.

Сяброўства ў MDCP дазваляе муніцыпалітэтам-удзельнікам абмяркоўваць і дзяліцца найлепшымі практыкамі ўстойлівага энергетычнага развіцця і адаптацыі да кліматычных зменаў, каб распрацоўваць і рэалізоўваць сумесныя праекты ў сваіх прыярытэтных сферах. Удзельнікі Платформы таксама карыстаюцца рознымі даступнымі магчымасцямі фінансавання, каб скараціць сваю энергетычную залежнасць і забяспечыць трываласць да кліматычных зменаў, тым самым паляпшаючы якасць жыцця сваіх грамадзянаў.

**Галоўныя мэты:**

- Абмяркоўваць і фармаваць нацыянальныя стратэгіі і прыярытэты ў сферы энергіі і клімату
- Дапамагаць Падпісантам Пагаднення Мэраў у выкананні абавязацельстваў у межах Пагаднення
- Паляпшаць камунікацыю, абмен ноў-хаў і досведам, перадачу тэхналогій сярод Падпісантаў Пагаднення Мэраў
- Заснаваць базу для развіцця Нацыянальных Дарожных Карт, каб ліквідаваць перашкоды і ствараць стымулы, якія зробяць магчымымі інвестыцыі ў сферу муніцыпальнай энергіі і клімату
- Аказваць тэхнічную падтрымку мясцовым уладам у рэалізацыі і маніторынгу іхных Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце
- Забяспечыць каардынацыю і сінэргію паміж існуючымі энергетычнымі і кліматычнымі ініцыятывамі на нацыянальным узроўні

| Краіна | Платформа | Удзельнікі | Колькасць сустрэч* | Старшыня |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| АРМЕНІЯ | Клуб Пагаднення ў Арменіі | 33 удзельнік | 1 | Спітак |
| БЕЛАРУСЬ | Клуб Пагаднення Мэраў у Беларусі | 32 удзельнікі | 2 | Полацк, Брэст |
| МАЛДОВА | Платформа мясцовага ўстойлівага развіцця | 42 удзельнікі | 4 | Кантэмір, Ялавень, Стрэшэнь |
| ГРУЗІЯ | Грузінскі Клуб Мэраў | 30 удзельнікаў | 4 | Руставі |
| УКРАІНА | Муніцыпальная платформа па клімаце і энергіі | 168 удзельнікаў | 8 | — |

* Колькасць сустрэч

## Нацыянальныя Дарожныя Карты

Пры падтрымцы экспертаў Пагаднення Мэраў – Усход кожная краіна распрацавала стратэгічныя арыенціры для стваральнікаў палітыкі і іншых зацікаўленых бакоў – Нацыянальныя Дарожныя Карты, накіраваныя на стварэнне спрыяльнай базы для падтрымкі супольнасцяў Пагаднення, дзеля эфектыўнай рэалізацыі лакальнай энергетычнай і кліматычнай палітыкі і выканання добраахвотных абавязацельстваў па скарачэнні выкідаў $CO_2$, паляпшэнні кліматычнай трываласці і зніжэнні энергетычнай беднасці. У Нацыянальных Дарожных Картах робіцца агляд і даюцца рэкамендацый для нарматыўнага і інстытуцыйнага асяроддзя па прыцягненні інвестыцый, па галоўных перашкодах і стымулах да эфектыўнага планавання і роста фінансавання дзеля рэалізацыі энергаэфектыўных праектаў у межах распрацаваных Падпісантамі Пагаднення Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце і г.д.

## Ключавыя перашкоды і стымулы рэалізацыі муніцыпальных праектаў

| | Перашкоды | Стымулы |
| --- | --- | --- |
| ФІНАНСАВЫЯ | • Абмежаваныя дзяржаўныя/муніцыпальныя фонды і доступ да крыніц фінансавання<br>• Недастатковыя магчымасці мясцовых уладаў па распрацоўцы і рэалізацыі праектаў, здольных атрымаць фінансаванне<br>• Недахоп унутранага муніцыпальнага досведу ў планаванні і прыцягненні інвестыцый | • Забеспячэнне грантавага са-фінансавання нацыянальнымі/міжнароднымі донарамі і доступ да іншых інструментаў фінансавання<br>• Умацаванне патэнцыялу мясцовых уладаў па распрацоўцы высокаякасных праектаў, здольных атрымаць фінансаванне<br>• Спрыянне абмену досведам і найлепшымі практыкамі па прыцягненні інвестыцый і даступныя фінансавыя механізмы |
| ЗАКАНАДАЎЧЫЯ І НАРМАТЫЎНЫЯ | • Недастаткова распрацаванае заканадаўства і нарматыўная база, а таксама палажэнні аб забеспячэнні яе выканання<br>• Неадпаведнасці паміж нацыянальным заканадаўствам і патрабаваннямі міжнародных фінансавых інстытуцыцый датычна праектных дакументаў<br>• Недастаткова развіты рынак банкаўскіх гарантый і нізкі ўзровень абароненасці правоў інвестараў | • Распрацоўка рэлевантных прававых норм і пастаянная падтрымка ў выкананні інструктыўных прадпісанняў усіх прынятых правілаў норм<br>• Гарманізацыя нацыянальнай нарматыўнай базы з патрабаваннямі донараў і міжнародных фінансавых інстытуцый<br>• Забеспячэнне адэкватных гарантый дзеля дапамогі ва ўмацаванні ўпэўненасці фінансавых інстытуцый у энергаэфектыўных інвестыцыях |
| АДМІНІСТРАТЫЎНЫЯ І ТЭХНІЧНЫЯ | • Недастатковыя адміністратыўныя і тэхнічныя магчымасці муніцыпалітэтаў для планавання і кіравання праектамі, заснаванымі на патрабаваннях міжнародных фінансавых інстытуцый, донараў і інвестараў<br>• Недахоп тэхнічных прафесійных навыкаў і экспертызы мясцовых кадраў, а таксама падрадчыкаў і распрацоўшчыкаў<br>• Кепскі тэхнічны стан муніцыпальнай інфраструктуры | • Падвышэнне патэнцыялу муніцыпалітэтаў у сферы планавання і кіравання праектамі, супрацоўніцтва з донарамі і інвестарамі<br>• Стварэнне эталонаў энергаэфектыўнасці муніцыпальных аб'ектаў, квантыфікацыя неграшовых выгад<br>• Прадстаўленне высокаякасных праектаў і аптымальных па кошце ўмяшанняў, маніторынг і дакументацыя вынікаў дзеля забеспячэння акупнасці зэканомленых сродкаў |

# Доступ да фінансавання

## Трэнінгі і кантактныя сустрэчы

Каб заахвоціць Падпісантаў Пагаднення Мэраў у краінах Усходняга Партнёрства, стварыць для іх магчымасці па ператварэнні іхных Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце ў канкрэтныя дзеянні і прыцягнуць неабходныя фінансавыя рэсурсы, была арганізаваная серыя трэнінгаў і сустрэч для наладжвання кантактаў, адаптаваных да кожнай краіны. Атрыманыя веды і практычныя навыкі **дапамаглі муніцыпалітэтам ператварыць свае ідэі праектаў у праектныя заяўкі** у адпаведнасці з базавымі патрабаваннямі супольнасці донараў і, такім чынам, паспрыяць своечасовай рэалізацыі муніцыпальных планаў дзеянняў і дасягненню іхных мэтаў у межах Пагаднення Мэраў.




**Донары і міжнародныя фінансавыя інстытуцыі, што прынялі ўдзел:**

EBRR, EIB, KFW, GIZ, NEFCO, SIDA, UNDP, USAID, IFC, Сусветны Банк, мясцовыя банкі і фонды пры ўдзеле дэлегацый ЕС у краінах Еўрапейскага Партнёрства, ініцыятывы і праекты, фінансаваныя ЕС (EU4Energy, EU4Climate, EU4Environment і інш.)

**Фокус гэтых падзей быў на:**

- фінансавых аспектах распрацоўкі і рэалізацыі Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце
- даступных фінансавых схемах і механізмах, якія можна выкарыстаць для прыцягнення фінансавання
- распрацоўцы высокаякасных праектных заявак, якія могуць быць рэалізаваныя і здольныя прыцягнуць фінансаванне
- наладжванні сувязяў паміж Падпісантамі Пагаднення і рознымі фінансавымі інстытуцыямі

### Партфелі праектаў

Для кожнай краіны Усходняга Партнёрства былі распрацаваныя нацыянальныя базы звестак муніцыпальных праектных заявак – Партфелі праектаў – у сферы энергаэфектыўнасці, узнаўляльнай энергіі і адаптацыі да кліматычных зменаў. Партфелі праектаў маюць на мэце палепшыць заўважнасць муніцыпальных інвестыцый і падтрымаць муніцыпалітэты ў пошуку патэнцыйных інвестараў, донараў і партнёраў, што павінна дапамагчы знайсці фінансаванне, неабходнае для рэалізацыі Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце. Гэтыя базы звестак утрымліваюць інфармацыю пра базавае энергаспажыванне планаваных праектаў, сутнасць прапанаваных мер, аб'ём патрэбных інвестыцый і чаканыя вынікі.

www.com-east.eu/en/armenia-fundings/

### Колькасць праектаў паводле сектароў

| | Вулічнае асвятленне | Узнаўляльныя крыніцы энергіі | Цэнтральнае ацяпленне | Энергаэфектыўныя будынкі | Энергаэфектыўны транспарт | Кіраванне адкідамі | Клімат | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Арменія | 7 | 8 | | | | | | 15 |
| Беларусь | 105 | 15 | 5 | 24 | | | 4 | 153 |
| Грузія | 4 | 7 | | 7 | 7 | 5 | 10 | 40 |
| Малдова | | | | 22 | | | | 22 |
| Украіна | 2 | | 1 | 12 | | | | 15 |
| | 118 | 30 | 6 | 65 | 7 | 5 | 14 | 245 |

# Сінергія з іншымі ініцыятывамі

Каб замацаваць найбольш эфектыўныя вынікі і дасягнуты эфект, больш эфектыўна пашыраць Пагадненне Мэраў і аказаць падтрымку Падпісантам Пагаднення ў выкананні іхных энергетычных і кліматычных абавязацельстваў, Пагадненне Мэраў – Усход скарысталася рознымі магчымасцямі, даступнымі ў краінах Усходняга Партнёрства для каардынацыі супрацоўніцтва і паляпшэння сінергіі з ЕС і іншымі міжнароднымі донарамі, праектамі і ініцыятывамі.

**Глабальнае Падгадненне Мэраў (GCoM)**

**Пагадненне Мэраў – Дэманстрацыйныя Праекты (CoM-DeP)**

**Ініцыятывы ЕС**
EU4Energy
EU4Climate
EU4Environment

**Іншыя праекты ў сферы энергіі і клімату, фінансаваныя праз ЕС**

Пагадненне мэраў
па клімаце і энергіі
Усходняе партнёрства

**Еўрапейскія і міжнародныя энергетычныя і кліматычныя ініцыятывы**
Мэры за эканамічны рост (M4EG)
Глабальны экалагічны фонд (GEF)
Сакратарыят Энергетычнай Супольнасці
Міжнародная энергетычная агенцыя

**Праекты праграмы Horizon 2020**

**Міжнародныя фінансавыя інстытуцыі**
EBRD
E5P
NEFCO
EIB
KfW
IFC

**Агенцыі ААН**
UNECE
UNDP
UNEP
UNIDO

**Міжнародныя агенцыі развіцця**
GIZ (Германія)
USAID (ЗША)
SIDA (Швецыя)
DANIDA (Данія)
Polish Aid (Польшча)

JRC
EUROPEAN COMMISSION

## Роля Аб’яднанага даследчага цэнтра ў падтрымцы Падпісантаў Пагаднення Мэраў

Аб’яднаны даследчы цэнтр (JRC) – гэта навукова-даследчая служба Еўрапейскай Камісіі, якая наймае навукоўцаў дзеля правядзення даследванняў у мэтах прадстаўлення незалежных, заснаваных на доказах навуковых і тэхнічных рэкамендацый і падтрымкі палітыкі ЕС. Ён грае цэнтральную ролю ў стварэнні, кіраванні і інтэрпрэтацыі калектыўных навуковых ведаў дзеля паляпшэння палітыкі ЕС і, дзякуючы вынікам сваіх даследванняў, спрычыняецца да здаровага і бяспечнага асяроддзя, бяспечных энергетычных рэсурсаў, устойлівай мабільнасці, здароўя і бяспекі спажыўцоў.

Аб’яднаны даследчы цэнтр таксама адказвае за тэхнічную і навуковую падтрымку ініцыятывы Пагаднення Мэраў па клімаце і энергіі. Ён працуе ў шчыльнай кааперацыі з офісамі Пагаднення Мэраў, каб забяспечыць Падпісантаў яснымі тэхнічнымі інструкцыямі і шаблонамі і паспрыяць паспяховаму выкананню іхных абавязацельстваў у межах Пагаднення Мэраў, а таксама выконваць маніторынг працэса рэалізацыі і дасягнутых вынікаў.

Падрабязней пра Аб’яднаны даследчы цэнтр: http://ec.europa.eu/dgs/jrc/

**У прыватнасці, падтрымка Падпісантаў Пагаднення Аб’яднаным даследчым цэнтрам уключае:**

- Складанне метадалагічнай базы ініцыятывы, у тым ліку дапаможнікаў для мясцовых уладаў
- Ацэнку і ўхваленне муніцыпальных Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце праз працэдуру зваротнай сувязі
- Распрацоўку ацэначных справаздач для ініцыятывы Пагаднення Мэраў
- Паляпшэнне працэсу збору звестак
- Сумеснае кіраванне тэхнічнай працоўнай групай па пытаннях звестак і распрацоўкі новага “стандарту” справаздач гарадскіх выкідаў, мэтавых паказчыкаў, планаў дзеянняў і адаптацыі да Глабальнага Пагаднення Мэраў
- Працу па метадалагічнай адаптацыі ў розных рэгіёнах свету
- Правядзенне тэхнічных трэнінгаў для гарадоў і рэгіёнаў, рэгіянальных экспертаў і актыўнасцяў па ўзмацненні патэнцыялу

# Камунікацыйная дзейнасць Пагаднення ў краінах Усходняга Партнёрства

**Дзейнасць па камунікацыі і прамоцыі** прадугледжвае папулярызацыю Пагаднення Мэраў па клімаце і энергіі, яго мэтаў, магчымасцяў і карысці ад удзелу, а таксама вынікаў і дасягненняў Пагаднення Мэраў – Усход праз рэалізацыю розных мер, накіраваных на паляпшэнне інфармаванасці, арганізацыю і ўдзел у тэматычных падзеях і іншых актыўнасцях для розных зацікаўленых бакоў на нацыянальным і міжнародным узроўні. Галоўная мэта – **папулярызаваць Пагадненне Мэраў па клімаце і энергіі і заахвоціць муніцыпалітэты ў краінах Усходняга Партнёрства далучыцца да ініцыятывы** і атрымаць карысць ад сяброўства ў супольнасці Пагаднення.

## Еўрапейскія тыдні ўстойлівай энергіі і Дні ўстойлівай энергі

Краіны Усходняга Партнёрства актыўна ўдзельнічалі ў **Еўрапейскіх тыднях устойлівай энергіі (EUSEW)** і арганізоўвалі **Дні ўстойлівай энергіі (SED)** у сваіх гарадах, каб пашыраць і дзяліцца найлепшымі практыкамі і інавацыйнымі ідэямі ў сферы чыстай і бяспечнай энергіі, энергаэфектыўнасці, больш шырокага выкарыстання ўзнаўляльных крыніц і ўстойлівага развіцця сваіх супольнасцяў.

### Арганізавана Дзён Энергіі




### Ахоп аўдыторы




## Прамоцыя Пагаднення Мэраў — Усход на нацыянальных і міжнародных падзеях




## Вынікі і змены паводзінаў

- Палепшаная інфармаванасць насельніцтва гарадоў-падпісантаў Пагаднення Мэраў у краінах Усходняга Партнёрства, якое даведалася пра ініцыятыву і падтрымлівае свае муніцпалітэты ў дасягненні кліматычных і энергетычных мэтаў
- Мясцовыя ўлады даведаліся пра даступныя фінансавыя інструменты і механізмы прыцягнення фінансаў і інвестыцый, а таксама пра тое, як прымяняць іх дзеля рэалізацыі Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце
- Стаўленне жыхароў гарадоў-падпісантаў Пагаднення Мэраў змянілася на карысць больш энергаэфектыўнага і экалагічнага стылю жыцця і эканомікі
- Супольнасці сталі больш адказнымі і актыўнымі ў пашырэнні і рэалізацыі розных энергаэфектыўных мер і мер па адаптацыі да кліматычных зменаў
- Падпісанты Пагаднення Мэраў дзеляцца сваім досведам і найлепшымі практыкамі з іншымі муніцыпалітэтамі на нацыянальным і рэгіянальным узроўні, каб выканаць ўзятыя абавязацельствы і забеспячыць устойлівае развіццё
















# CoM-DeP: ад планаў – да жыцця

**Пагадненне Мэраў – Дэманстрацыйныя праекты (CoM-DeP)** – гэта праграма, фінансаваная праз ЕС і распрацаваная ў адказ на выклікі, з якімі сутыкнуліся ў рэгіёне Усходняга Партнёрства невялікія муніцыпалітэты з насельніцтвам менш за 200 000, якія падпісалі Пагадненне Мэраў. Многія Падпісанты не маюць тэхнічных ці фінансавых магчымасцяў для рэалізацыі сваіх Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі (і клімаце), якія з'яўляюцца ключавымі дакументамі, што апісваюць, як кожны з муніцыпалітэтаў плануе дасягнуць сваіх мэтавых паказчыкаў па скарачэнні выкідаў $CO_2$. ЕС аказвае ім падтрымку праз дэманстрацыйныя праекты, якія паказваюць, як муніцыпалітэты могуць эфектыўна ператвараць свае Планы дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце ў практычныя дзеянні.

Тыповы аб'ём фінансавання праекта складае **ад 0,5 да 1,4 млн еўра**. Праекты непасрэдна рэалізуюцца муніцыпалітэтамі (разам з праектнымі партнёрамі), што робіць іх больш здольнымі і моцнымі ў далейшай рэалізацыі праектаў.

Муніцыпалітэты-удзельнікі атрымліваюць фінансавую, адміністрацыйную і тэхнічную падтрымку, каб рэалізаваць устойлівыя энергаэфектыўныя праекты, што вядзе да скарачэння аперацыйных коштаў і выдаткаў на энергію для муніцыпалітэтаў і жыхароў, а таксама скарачае выкіды $CO_2$.

Падрабязней пра праграму CoM-DeP: **www.com-dep.eu**

**Выбраныя дэманстрацыйныя праекты факусуюцца на:**

- рэнавацыі грамадскіх і жылых будынкаў
- мадэрнізацыі сістэмы цэнтральнага ацяплення
- укараненні сістэмы энергаэфектыўнага вулічнага асвятлення
- паляпшэнні грамадскага транспарту
- паляпшэнні энергаэфектыўнасці ў сістэмах сцёкавых вод

**Фаза I**

2014-2018
19 праектаў/
19 муніцыпалітэтаў
**18 400 000€**
фінансаванне ЕС
**79%**

**Фаза II**

2018-2021
14 праектаў/
15 муніцыпалітэтаў
**13 800 000€**
фінансаванне ЕС
**77%**




Фаза I    Фаза II

| | |
|---|---|
| **Украіна** | **17** |
| **Малдова** | **6** |
| **Беларусь** | **5** |
| **Арменія** | **3** |
| **Грузія** | **2** |

## **Дасягнутыя вынікі*** ў муніцыпалітэтах, дзе рэалізоўвалася праграма CoM-DeP:

- **238** жылых і грамадскіх будынкаў прайшлі рэнавацыю
- **97** сістэм узнаўляльнай электраэнергіі ўсталяваныя
- **35** будынкаў дзіцячых садкоў і школ прайшлі рэнавацыю
- **10** сістэм вулічнага асвятлення ўсталяваныя/мадэрнізаваныя
- **10** сістэм цэнтральнага ацяплення ўсталяваныя/мадэрнізаваныя
- **1** сістэма водазабеспячэння палепшаныя
- **1** транспартная сістэма палепшаная

**1846 працоўных месцаў забяспечаныя**

** на 1 красавіка 2021*

# Перспектывы Пагаднення Мэраў - Усход: што далей?

За больш чым 10 год у краінах Усходняга Партнёрства Пагадненне Мэраў па клімаце і энергіі дасягнула значных вынікаў і здабыла рэпутацыю моцнага еўрапейскага брэнда, які застаецца прывабным для муніцыпалітэтаў. Ініцыятыва імкліва разраслася і стала наймацнейшай па колькасці ўдзельнікаў па-за межамі Еўрапейскага Саюза.

Такім чынам, грунтуючыся на досведзе двух папярэдніх фаз праграмы – CoM East I (2011 – 2015) і CoM East II (2016 – 2021) – **дзеля далейшай энергетычнай і кліматычнай дзейнасці ў рэгіёне была запушчаная трэцяя фаза - CoM East III.** Тады як мэтай Фазы I было падтрымаць муніцыпалітэты ў працэсе далучэння да ініцыятывы, а Фаза II больш факусавалася на распрацоўцы і рэалізацыі Планаў дзейнасці па ўстойлівай энергіі і клімаце (SECAP), Фаза III мусіць аказаць больш мэтавую падтрымку сённешнім і патэнцыйным Падпісантам праз досвед рознага ўзроўню.

**У прыватнасці, Пагадненне Мэраў - Усход III засяродзіцца на наступных галоўных аспектах лакальнага ўстойлівага развіцця і зялёных рэформаў:**

- Заахвоціць усё новыя мясцовыя ўлады далучыцца да Пагаднення Мэраў і выканаць ягоныя мэты на 2030, а таксама ўзмацніць падтрымку Падпісантаў з боку рэгіянальных і нацыянальных уладаў
- Аказваць падтрымку Падпісантам у распрацоўцы і рэалізацыі іхных Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце і ўзмацненні тэхнічнага патэнцыялу дзеля лепшага мясцовага планавання і кіравання
- Аказваць мэтавую падтрымку, каб палегчыць доступ Падпісантаў Пагаднення Мэраў да фінансавання муніцыпальных праектаў, у прыватнасці тых, што з'яўляюцца часткай іхных Планаў дзеянняў па ўстойлівай энергіі і клімаце
- Падвышаць інфармаванасць мясцовага насельніцтва пра важнасць мясцовай энергетычнай і кліматычнай актыўнасці
- Даць мясцовым супольнасцям эфектыўныя інструменты, што дапамогуць ім зрабіць актыўны ўнёсак у вырашэнне мясцовых праблем



**www.com-east.eu**

EU4Energy

**Пагадненне мэраў**
па клімаце і энергіі
**Усходняе партнёрства**

## Праект рэалізаваны праз Канцсорцыюм, якім кіруе ініцыятыва Energy Cities:

ENERGYCITIES

Climate Alliance

KOMMUNAL KREDIT PUBLIC CONSULTING

COMMUNITIES ASSOCIATION of ARMENIA

Interakcia

EEC · ევც

AEER

МУ Association «Energy Efficient Cities of Ukraine»

Ініцыятыва EU4Energy ахоплівае ўсю падтрымку ЕС, накіраваную на паляпшэнне энергазабеспячэння, бяспекі і звязнасці, а таксама на пашырэнне энергаэфектыўнасці і выкарыстанне ўзнаўляльных рэсурсаў у краінах Усходняга Партнёрства: Арменіі, Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны. Гэтыя мэты дасягаюцца праз фінасаванне праектаў і праграм, што дапамагаюць рэфармаваць энергетычныя рынкі і скараціць нацыянальную энергазалежнасць і энергаспажыванне. У далейшай перспектыве гэта зробіць энергазабеспячэнне больш надзейным, празрыстым і даступным, тым самым, скарачаючы энергетычную беднасць і выдаткі на энергію як для жыхароў, так і для прыватнага сектару.

Падрабязней: **www.EU4Energy.eu**

Праект фінансуецца Еўрапейскім Саюзам у межах ініцыятывы EU4Energy

Погляды, выказаныя ў гэтай публікацыі, з'яўляюцца выключнай адказнасцю праекта CoM East і не абавязкова адлюстроўваюць погляды Еўрапейскага Саюза

**www.com-east.eu**